Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Ц›на з перэсылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к,, на 6 мес.— 1 р 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес. — 25 к. За границай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес —2 р., 3 мес. —1 р. Перамена адрэсу — 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для веда›а рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год VII. 22 (4) сакавіка (марца) 1912 г. № 12—13.

# ВЯСЁЛЫХ СЬВЯТ!

*Вільня, 22 (4) марца 1912 г.*

Час ляціць, як вокам замерыць, а жыцьцё загразло, бытцым воз у балоці, асабліва-ж жыцьцё вёскі ў нашым краю. У горадзі жывеш, дык, здаецца, нават і бойка ўсё кіпіць, розные партіі, паміж сабой сварацца, газэт выходзіць усё больш, Дума будзе ўжо зараз новая, гавораць аб народзі... А давялося нам пакруціцца ў вёсцы і прыглядзецца да цяперашніх валасных парадкоў, убачыць ешчэ раз які тутака суд і справядлівасць, як збіраюць падаткі з мужыцкаго шэраго сьвету.

Вось валасны сход. Выбіраюць старшыню; сам земскі прыехаў (нават даволі справядлівы чэлавек). Земскі „пільнуець“ выбары; стары старшыня, праўдзівы валасны „Бісмарк“, з бліскучай бляхай на грудзёх стаіць спакойна: ужо ўсё ён зрабіў! У шынку сказаў даваць гарэлкі і закускі, колькі хочэ кожны з „выбарных“; на сходзі у ўсіх вочы заплюшчываюцца—насёрбаліся! але стаяць ціха, бо „земскі“ тут.. Агент старшыні сунець у рукі некаторым па рубліку... Толькі „левые“ ўсе цьвярозые, бо хто проціў старога старшыны, той яго гарэлкі ня пьець! „левые“ гудзяць: „нашай крыві напіліся, прадаліся!“ Старшыня неправільна выбраў выбарных—„сваіх“. „Ур-а-а!“ чуваць раптам са зборнай. Абабралі старога старшыню!

Расходзяцца. Выбарные „старшыновые“ ідуць піць магарыч.—Часць мужыкоў хочуць даць тэлеграму, што выбары незаконные, але ня ведаюць, куды і як.

«Неправільна!» Некаторые ня ведалі, куды класьці галкі! Трэба выбіраць усей воласьцю—ўсіх бы не падкупіў! Магарыч, нябось, здзярэць посьле з мужыкоў с працэнтам!“

Праціскаецца да земскаго праз кучу народу самы бедны мужык ў вёсцы, Арцём; паказываець нейкую кніжэчку, за ім баба. Жаляцца: «Вашабродзе»! на нашым вучастку тры хаты: дзьве бедные, трэйця Юркава—багатая; дык старшыня 15 рублёў падатку магазыннаго з Юркі зняў, а ўзлажыў на нас. Німа нам рады!» Земскі стараецца зразумець, у чым справа. Але, каб праверыць «магазынные» справы, трэба сэнаторскую рэвізію прыслаць!—«Вы абабралі старшыню, ніхай ён разбярэць!»

Пасьля старшыня усё-ж такі па 2 рублі скінуў...

Глядзелі і мы тую кніжку, дзе пішуцца падаткі; сам чорт не разбярэць, што там напісана і за што падаткі заплочэны! Выглядаець, як бытцым з аднэй бабкі 75 к. лішку ўзялі. Каб гэта разгрысьці, трэба ізноў сэнатарскую рэвізію, ці завясьці падатнаго інспэктара, каторы бы браў падаткі пад акуратные квітанціі. Адным словам калі паварушыць кожную с 1008 валасьцей, то аткрыецца агульны крымінал! Тымчасам Гасударствены Савет хочэ нам і на далей пакінуць валасные суды, а «правые» у Думе ўсімі сіламі сапраціўляюцца завядзеньню ўсестановай воласьці!

## За апошні тыдзень.

### З Расеі.

Заўсягды перад канцом году падыймаюцца гутаркі аб тых пераменах, якіе прынясе новы год. У гэтых гутарках зменяюць адных міністроў, назначаюць другіх, суляць маніфэсты, новые прыказы і т. д. Але найчасьцей усё гэта канчаецца аднэй гутаркай і больш нічым.—Цяпер, пад канец жыцьця Трэйцяй Думы, каторай праз колькі месяцоў не стане, так сама, як перад канцом году, пачынаюць шмат гукаць аб нейкіх вялікіх пераменах. Адны кажуць, бытцым аткрыцьце Думаю прапажы з міністэрства судоў важных дакумэнтоў, а так сама іншые аткрыцьця давялі да таго, што міністэр судоў (юстіціі) і ваенны міністэр маняцца падацца у адстаўку. Другіе даводзяць, бытцым, наадварот, пакіне службу прадседацель міністроў, міністэр фінансоў, Коковцов: на яго злуюць „націоналісты“, каторых ён ня хочэ слухаць і вядзе палітыку тэй дарогай, якой сам хочэ. Хто прарочыць праўду—німа ведама; можэ прылучыцца і тое, што ўсё далей астанецца па стараму...

Ўсё па стараму... Запраўды, па стараму судзяць інтэндантоў; па стараму ідуць сэнатарскіе рэвізіі; па стараму шмат дзе ў Расеі пануе голад, а з ім пашыраюцца ўселякіе хваробы... І, здаецца, так усе да гэтаго прывыклі, што ніхто нікога ўжо і не вінаваціць у гэтых сумных справах. Дык і гутаркі аб перамені міністроў ня могуць мець вялікай вагі: для гэтаго не відаць асаблівых прычын. Ёсць, ўсё-ж такі, прычына, катораяя не дае шмат каму спаць: гэта—новые выбары у Чацьвёртую Думу. „Правые“, „націоналісты“ і „акцябрысты“—гэтые партіі ведаюць, што ў новай Думе тая здабудзе больш дэпутацкіх мейсц, за каторую будзе стаяць вышэйшае правіцельство. І ня дзіва, што кожная з іх вядзе вайну проці тых міністроў, каторые больш прыхільны да другой партіі.

Вось, аткуль ідуць усе гутаркі аб пераменах; яны скончацца тады, калі будзе ясна, с кім пойдзе на выбарах правіцельство: с „правымі“, ці з „націоналістамі“, ці мо́, як калісь, з „акцябрыстамі“. Пасьля выбару аднэй с тых партій будзе ўжо ясна, каторы з міністроў астанецца на сваім мейсцы і каторы кіне яго. Цяпер-жэ гукаць аб гэтым рана.

### У Думе і каля Думы.

У суботу, 17 марца, Дума на Велікодные Сьвяты закрылася;вось, апошні тыдзень і былі назначэны заседаньня на кожын дзень, каб хутчэй скончыць з бюджэтам. Шмат часу занялі сьмета Сыноду і сьмета міністэрства унутрэных спраў. Блізка ўсе дэпутаты жаліліся, што вось ужо пяты год Дума разбірае гасударственые даходы і расходы і кожын раз выказывае свае жаданьня, каб тое ды сёе перамяніць, але жаданьня гэтые не спаўняюцца.—З іншых спраў, якіе за апошні тыдзень разгледаліся ў Думе, трэба адзначыць перш-наперш „польскі“ запрос аб тым, якім правам у Дзісенскім павеці ў народных школах дзяцей-каталікоў, каторые лічаць сябе палякамі, вучаць рэлігіі не па польску, а па расейску. Дума той запрос прызнала „сьпешным“ і прыняла яго; у гутарках чутны былі галасы, што вучыць рэлігіі дзяцей трэба ў іх роднай мове, але ніхто з дэпутатоў ад нашаго краю не паставіў ясна і цьвёрда пытаньня: а чаму па беларуску вучыць нельга? — Далей даволі цікава была справа аб пазваленьне прадаваць селянам зямлю ў так-званых „майоратных“ дварох, каторые—па закону—не павінны прадавацца. Тут паднялася спорка: поступовые дэпутаты казалі, што такую зямлю трэба прадаваць толькі мейсцовым

## Дзень рожэвай кветкі.

Зарумянілося на ўсходзі небо, і земля пачала скідаць з сябе белы вэлён лёгкаго, маёваго туману.

Ціха, бытцым будзячыся па здаровым сьне, уздыхнуў лес; і гэты спакойны, здаровы ўздох пакаціўся ў шырокі луг, захвалеваў зялёным дываном сочнай травы, аддаўся на жытнім моры...

Драч апошні раз прабубнеў сваю хрыплую песьню, а разбудзіўшыеся ластаўкі разселіся ў рад на выступаючым са стрэхі шастку і пачалі строіць сваю лагодную капэлю.

На ўсходзі ўсё ешчэ калыхалася чырвоная зарніца, як сонцэвы сьцяг, але вось скрозь чэрвень гэтаго сьцягу прабіўся ў гару першы сноп вострых, доўгіх праменёў...

Раздаўся чароўны павітальны гімн усхадзячаму сонцу, сымволу дабра і праўды...

У адну з гэткіх чароўных раніц збудзілася пад малым ваконцэм селянскай хаты чырвоная рожа. . раскошных прасонках скранула лісткамі, і з аксамітнай іх зелені пасыпаліся шнуркі брылянтавай расы; ешчэ раз скранулася рожа, і на аднэй з галінак трэснуў кветны пучок, а с паміж зялёных клапцікоў выглянула чырвоная кветка, першая кветка гэтай вясны ..

Паміж стыдліва напоўрасхіленых кветных лісткоў закаціліся дзьве капелькі чыстай, іскрыстай расы і выгледалі, як пара сьмяючыхся вочэк дзеўчаці.

А калі праз зялёные косы плакучай бярозы прабіўся сонцэвы прамень і пацалаваў кветку, па ей разліўся густы румянец, і пара сьветлых вочэк зайскрыліся, бытцым стрымліваючы у кветнай душы раскаты радаснаго, пустога сьмеху.

Гэтак расьцвіла рожэва кветка пад скромным ваконцэм селянскай хаты, але ня суджэна было ей тут красаваці, ўдыхаючы пах лясоў і лугоў. Гэтай-жэ раніцай адламалі рожэву кветку і аддалі праеждждаўшаму пану, што ехаў у горад.

Калі гаспадар ламаў з рожэваго куста кветку, яна, схіснуўшыся, ураніла свае вочкі, бытцым дзьве дробные сьлёзкі і сталася маркотнай, як зжатае поле...

Прыбыўшы ў горад, пан увайшоў у сьветлые пакоі з залочэнымі белымі мэблямі, з мяккімі пэрскімі дыванамі, па каторых ціха ступалі абутые у скуру ногі людзей, як рысь паступае па сівым імху, чэкаючы здабычу.

Проці яго выйшла белая паня с цёмнымі валасамі і белай, як каліноў цьвет, аткрытай шыей; пан пацалаваў яе пахучую руку і, пацалаваўшы перад тым рожэву кветку, падаў у рукі белай пані; тая ўшпіліла яе лёгка дрыжачай рукой у свае валасы.

Рожэва кветка на цёмна-буйных валасах белай пані схінулася, як бранка ў няволі, каторая, выплакаўшы ўсе сьлёзы, села пад цёмным борам і чэкае прыходу незнанай долі.....

. . . . . . . . . . . . . . . . . .

Сьнедаючы за сталом, устаўленым крышталовымі кружкамі і малочна-белай порцэлянай, паня прышпіліла рожэву кветку свайму маладому палюбоўніку, да леваго вылогу чорнаго фрака.

Выходзячы з сьветлых пакоеў паніч той лёгка прыціснуў пальтом рожэву кветку, і яе кволые клапцікі пакрыліся сеткай чуць відочных загібоў; а калі ён ішоў вуліцай і сонцэ заглядало на кветку, яна хіліла сваю галоўку ўсё ніжэй, бытцым стыдаючыся глянуць яму ў вочы.

Гэтак прыйшлі яны ў цяністы сад, дзе паміж дрэў і кветак біў халодны фантан. Брызгі жывой вады ўзлеталі высока, іскрыліся на сонцы і густым дажджом сыпаліся ў ніз, на зямлю.

Паніч, сеўшы на лаўцы, дастаў с кішэня газэту і пачаў чытаць. Пражыло палуднёвае сонцэ, яго сухіе, гарачые прамені даходзілі да рожэвай кветкі выпіваючы пасьледкі сокоў. Яна—сасмагшая, хворая—пачала вянуць.

Злажыўшы газэту, паніч закурыў цыгару і зірнуў раз і другі на кветку: кветка аплюхла і страціла сьвежасць. Адшпіліўшы і пакруціўшы момэнт у руках, паніч кінуў яе на малеваную лаўку ў садзі, а сам пайшоў за сваімі справамі.

Рожэва кветка лежала на малеванай лаўцы, а з ўсіх старон дыхало на яе жарам і лажыўся дробны пыл з расцёртых у пяску плювоцін. Каб яна магла крычаць, прасіла-б на голас каплі, халоднай каплі с фантану! Але кветка маўчала; каплі жывой вады іскрыліся ў сонцы і пераліваліся, а да яе даходзіў толькі іх плеск...

Хутка вянула кветка, а сеткі загібоў ўсё цямней і глыбей адзначаліся на кветных клапціках ешчэ не так даўно сьвежай, пахучай рожы...

селянам—суседзям, калі у іх сваей нехватае; „правые“ і „націоналісты“ дамагаліся наадварот, каб тую зямлю прадавалі і чужым. Усё-ж такі Дума пастанавіла прадаваць толькі мейсцовым людзям. —Урэшці паднялася ў Думе справа аб тое, ці можна пазволіць кабетам, каторые скончылі унівэрсытэт, займацца адвакацтвам? Дума і гэта зацьвярдзіла: калі кабеты могуць быць дактарамі, чаму ім нельга быць адвакатамі?

## З заграніцы.

На пытаньне вялікіх дзержаў, на якім фундамэнці магла бы Італія зрабіць с туркамі згоду, італьянцы атказалі, што Турція павінна аддаць у іх рукі Трыполіс і забраць адтуль сваё войско; бяз гэтаго згоды быць ня можэ. Турція, пачуўшы гэта, абвесьціла, што яна на такую згоду прыстаць ня можэ. Тады дзержавы надумалі спытацца у туркоў: а як жэ яны думаюць скончыць вайну? На гэта атказу пакуль-што не было.—Тым часам Італія ўсё бліжэй і бліжэй падсылае свой ваенны флот да граніц Эўропэйскай Турціі: яна, відаць, думае, што гэтак туркоў запужае.

Вельмі цікавые весткі ходзяць аб падарожы немецкаго імператара Вільгэльма, каторы быў у гасьцях у аўстрыйскаго і італьянскаго каралёў. Асабліва цікава тое, аб чым ішла гутарка між Вільгэльмам і каралём Італіі. Кажуць (і гэтаму можна верыць), што ўсё гукалі яны аб трайным хаўрусе між Немеччынай, Аўстрыей і Італіей. З гэтаго хаўрусу, сказаць праўду, мелі карысць толькі немцы ды Аўстрыя, асабліва-ж гэта апошняя, бо ей удалося без ніякіх перашкод забраць у свае рукі Боснію і Гэрцэговіну; адна Італія карысьці ня мела, дык цяпер і надумалася захапіць Трыполіс, веручы, што сябры ей памогуць. Але тые памагаць і ня думалі! Дык Італія пачала зблізкацца з Расеей, каб разам з двух бакоў прыціснуць супольных непрыяцелёў — туркоў.—А тут тымчасам суседка Немеччыны, Францыя, бачучы што с трайнога хаўрусу адзін член уцякае, пачала страшыць немцоў, што на іх нападзе супольне з Англіей, каб адабраць сваю колішнюю зямлю, каторую у 1871 гаду немцы зваевалі. Вось калі заварушыўся Вільгельм, ды папёр хутчэй угаварываць італьянскаго караля, каб не кідаў хаўруса з немцамі. Ведама, што Італія тады ня выйдзе с хаўрусу, калі той дасць ей больш карысьці, чым падмога Расеі. Калі-ж проці туркоў пойдуць і вялікіе эўропэйскіе дзержавы, дык туркам прыдзецца дрэнна,—хіба, што прыступаючы да дзялідзьбы чужога дабра, тые дзержавы самі між сабой паб'юцца.

Хаця ў Кітаі ешчэ ёсць правінціі, дзе не умацавалася йшчэ рэспубліка, ўсё-ж такі новы выбарны урад вядзе вялікую работу над устройствам добраго парадку і фінансовай гаспадаркі. Калі ня будзе мець грошы, дык і сілы у яго ня будзе; тады кожын мог бы лёгка пакрыўдзіць гэты спакойны народ. Значыць, паставіўшы на першым мейсцы грашэвые справы, кітайцы робяць зусім правільна. Цікавая рэч: паміж кітайскімі міністрамі бачым двух рэволюцыонероў, і яны вельмі добра працуюць дзеля карысьці сваей бацькоўшчыны.

У Англіі забастоўка углекопоў памалу спыняецца. Рабочые ўжо ня могуць даўжэй дзержацца і прыступаюць ізноў да работы. У некаторых мейсцох ім павялічылі плату; у другіх—ня хочуць. А тут усюды нехватае каменнаго вугля. Здаецца, аднак, што рабочые заваюють сабе вышэйшую плату.—А поруч з змаганьнем рабочых за лепшые заробкі, тутака кабеты дабіваюцца роўных правоў з мужчынамі. У парлямэнці (думе) чуць-чуць не прайшоў закон, каб ўсім кабетам даць права выбіраць дэпутатоў: закон аб гэтым аткінулі некалькімі галасамі, каторых праціўнікі роўных правоў для кабет мелі болей, чым іх заступнікі. Але з гэтаго відаць, што ў Англіі недалёка ўжо той дзень, калі разам з мужчынамі будуць на выбарах падаваць свае галасы і жонкі.

## З'езд коопэратароў.

Пры аткрыцьці з'езду дэпутаты ад крэдытных і іншых, коопэрацыйных хаўрусоў, каторых сабралося з усіх канцоў Расеі каля 400 душ, зразу паказалі, што яны ехалі ў Пецербург не дзеля пустой гутаркі, а дзеля сур'ёзнай работы: яны ўсе ў вадзін голас адмовіліся чытаць цэльную кучу пісем і тэлеграм с паздраўленьнямі з'езду і ўселякімі жаданьнямі для яго, каб дарма часу не траціць. І дружная, шчырая праца зразу закіпела.

Прыемна было глядзець, з якой верай у будучыну працаваў з'езд. Відаць, што коопэрація—супольная, хаўрусная работа дзеля палепшэньня свайго жыцьця—гэта ўжо не ідэя, ня думка некалькіх людзей, а жыцьцёвая патрэба. Народ пазнае ўсё болей, што сваю долю трэба выкаваць сваімі рукамі; ён і ідзе па гэтай дарозі.

На першым мейсцы прыйшлося з'езду паставіць пытаньне аб тым, каб вызваліцца ад тых перашкод, каторые коопэрація спатыкае на сваей дарозі. Глаўная перашкода —гэта ўселякіе формальнасьці, каторые прыходзіцца спаўняць пры аткрыцьці ўселякіх хаўрусоў, гэта залежнасць ад пазваленьня адміністраціі, катораго дабіцца ня лёгка. Вось і трэба завясьці такі новы закон каторы пазволіў бы аткрываць крэдытные і іншые хаўрусы „явочным“ спосабам,—значыць, ня просячы пазваленьня, а толькі паведамляючы адміністрацію, што вось такіе-то людзі аткрываюць такі-то хаўрус. І ў законе павінна быць ясна паказано, хто мае права і на якім фундамэнці прыступаць да устройства коопэраціі; тады ніякая „палітыка“ не здалее задзержываць гэтай важнай для народу справы.

З'езд прызнаў, што найбольшую вагу маюць цяпер крэдытные хаўрусы. Без крэдыту ня можэ развівацца ні гаспадарка ні рэмясло, ні гандэль. Німа што брацца за другіе справы, пакуль гэта добра не наладзіцца. Цяпер аграмадные грошы народ складае ў казённые зберэгацельные кассы (пры почтах); вось, адтуль пазыкі нікому не выдаюць, і грошы на мейсцу ніякога абароту ня робяць. Такіе грошы казна павінна пазычаць за невялікіе працэнты хаўрусным банчкам: калі ў іх будзе больш капіталу, яны могуць выдаваць вялікшые пазыкі і на даўжэйшы час, значыць, чэлавеку лёгка будзе і якую фабрыку пастроіць, ці то, за іншы інтэрэс узяцца, с катораго даход пачне ісці толькі праз пару гадоў, і праз пару гадоў можна будзе выплаціцца. Толькі крэдыт на даўжэйшы тэрмін паможэ і селянам падняць сваю гаспадарку, правясьці, дзе трэба, канавы, асушыць балоты, пачысьціць пожні і т. д.—Каб павялічыць капіталы хаўрусных крэдытных таварыств, у Маскве аткрыўся Народны Банк, каторы сабраў мільён рублёў і тые грошы будзе пазычаць хаўрусам. Але і капітал Маскоўскаго Народнаго Банку залішне йшчэ малы, каб здаволіць ўсіх; дык з'езд дамагаецца, каб казна народные грошы, зложэные у зберэгалках, пусьціла ў абарот на карысць самога ж народу.

Ешчэ адну дужа важную справу разбіраў з'езд: гэта —аб прадажы селянскаго дабра не цераз перакупшчыкоў—дробнымі часткамі, а гуртам—вялікім купцам, ці ў інтэнданцтва. З'езд апрацаваў праект такіх селянскіх хаўрусоў, каб усё дабро сваё прадавалі разам—вялікімі партіямі. Тады і цэны шмат падыймуцца.

Усе хто быў на з'ездзі, верталіся дамоў з моцнай верай, што вялікая справа коопэраціі, справа хаўруснай працы здабывае для сябе ўсё мацнейшы грунт. І кожын павёз з сабой багаты запас практычных ведамасьцей, якіе дало жыцьцё ўсіх коопэрацій у Расеі, практычнай навукі, як рабіць сваё дзела, куды кіравацца. Ніхай-жэ работа з'езду дасць як найболей карысьці ўсім коопэрацыям, ніхай збудзіць веру ў будучыну гэтай справы ў тых, хто дагэтуль недаверчыва глядзеў на коопэрацію. Ніхай і ў нашай староцы байчэй горнуцца да яе людзі, бо і наша задача—збудаваць для народу моцны экономічны фундамэнт, без катораго цяжка гаварыць аб разьвіцьці культуры народу!

## Новы хаурус „націоналістоу“.

У нядзелю, 18 марца, у Вільні аткрыўся новы „національны“ расейскі хаўрус. І мэта хаўруса, і людзі ў ім—ня новые: зыйшліся тут вядомые ўжо Ковалюкі, Солоневічы, Тепловы і т. п., каторые дагэтуль займаліся перэварачываньнем беларусоў у „істінно-рускіх“ кожын паасобку, а цяпер будуць гэта рабіць усе разам. Відаць, конкурэнція і вечные спорки аб той „зьвінячы мацунак“, без якога „патрыоты“ гэтые нічога рабіць не прывыклі, надаеў „невядомым прыяцелям“, каторые даюць грошы „націоналістам“ і звычайным чорнасоценцам,—вось, і далі прыказ: „даволі вам сварыцца,—працуйце далей усе разам, хаўрусам“.

Сказана — зроблена: учэрашніе ворагі і конкурэнты зразу зрабіліся шчырымі сябрамі і дружна бяруцца за супольную „работу“.

Перэд аткрыцьцем гэтаго новаго хаўруса „націоналісты“ і ўсе „правые“ пастанавілі зрабіць адзін супольны камітэт, каб на выбарах у Чацьвёртую Думу ад „русскаго населеньня“ выбраць у дэпутаты „сваіх“ людзей. Але аказалося, што і між самымі „націоналістамі“ згоды німа, што ня ўсе згаджаюцца выбіраць так, як загадае п. Солоневіч, або Теплов: вось, так званае „Бѣлорусское Общество“ надумало, мусіць, выставіць і сваіх кандыдатоў у дэпутаты, дый адмовілося прылучыцца да агульнаго „національнаго“ комітэту.

---

Адвячоркам прыйшоў у сад чэлавек брудна адзеты і, знайшоўшы кветку на лаўцы, узяў яе у свае рукі і пачаў забаўляцца. Найперш адшчыпнуў чэранок, пасьля пачаў расхіляць недаразвітые клапцікі сваімі бруднымі пальцамі. Калі кончыў гэту работу, кветка быццым разцьвіла; але гэта быў толькі чмут майстра с паплямленымі пальцамі: ён, разрываючы грудзі да самаго сэрца рожэвай кветкі, дабіў яе. Яна цяпер ешчэ хутчэй пачала вянуць.

Калі-ж на кветных клапціках ад грубых і брудных пальцоў пайшлі гнойные плямы, і чэлавеку здакучыло забаўляцца ей, ён, як палюбоўнік панін, кінуў яе ізноў на малевану̇ю лаўку.

Вечэрам прыйшоўшые людзі скінулі кветку далоў і ўтапталі ў лужыну, каторая зрабілася там ад вады с фантана, калі раз вецер пахінуў у бок жывы іскрысты стоўб сваім напорам.

А поўначы, зачыніўшы сад, вартаўнік, узяўшы мятлу, пачаў абметаць сьмяцьцё кругом фантана Метла заняла і рожэву кветку і, доўгі час качаючы яе па курадымных сьцежках, прыгнала да памыйніцы, куды скідалося ўсё сьмяцьцё са сьцежэк гарадзкога саду.

. . . . . . . . . . . . . . . . . .

У памыйніцы канала рожэва кветка, а перад яе вачамі маячылася убраная у правідны белы вэлён земля, як маладая красуня, заснуўшая спакойным сном. Рожэвы сьцяг на ўсходзі, прадвестнік сонца, сымволу дабра і праўды... Дзьве капэелькі расы, падобные да пары сьмяючыхся вачэй, каторые тояць у кветнай душы раскаты пустога, вясёлаго сьмеху...

А калі ўсходзіло над зямлёй ізноў сонцэ, рожэва кветка ў памыйніцы ўздыхнула апошні раз на гэтай зямлі, аддаючы сваю бязвінную душу ў рукі міласернаго Бога, што стварыў яе.

**Власт.**

## Рабы.

(*Перароблена с Каляды*).

Нават і радзіўся не зусім так, як найбольш родзяцца,—прымерам у якім-колечы брудным кутку, дый цэлай кучай; не, радзіўся, як і прыналежыць іхняму роду, ў вялізарных, аздобных мурах, на чыстай, як пярына мяккой саломе і то адзін-адным.

Вялізарная, таўстая, сытая, паважная матка ешчэ і не адсапался добра калі ўжо першы піск дзіцяці стрывожыў увесь сьвінарнік.

Па ўсіх загародках, каторые пароблены былі абапол доўгаго калідору і дзе жылі то далейшая, то бліжэйшая радня, або хоць і зусім чужые, але так сама з важнейшаго роду,—пайшоў вялікі непакой.

Рохкнуў першым, высунуўшы с саломы лыч, стары рабы кнур; за ім адазваліся ў суседніх загародках кармнякі; адтуль рохканьне перэдавалося і шырылося далей і далей,—ешчэ момэнт—і узняўся такі гармідэр, што, хоць гэта была самая поўнач, ачнуўся нават вартаўнік, каторы смачна хроп на бруднай тухлай саломе ў цеснай баковачцы, прыбудаванай да сьвінарніка. Падняўся Марцін, працёр кулакамі вочы, пацягнуўся і, нашчупаўшы на лежанцы сернікі, запаліў ліхтарню, адчыніў дзьверы на калідор і стаў абходзіць па чародзі ўсе загародкі, падыймаючы агонь у верх. Натрапіўшы ўрэшці на прычыну трывогі—радзіны, затрымаўся Марцін, абвёў ліхтарняй ўсю загародку, зважна прыглядаючыся, дый, мармочучы нешта сабе пад нос, сплюнуў, завярнуўся і пайшоў будзіць аканома.

Не рад, відаць, быў пан аканом а гэткай пары вылазіць с цёплай пасьцелі: доўгі час круціў ён сваімі нашупырэнымі, як у таракана, жоўтымі вусамі, але што-ж ты зробіш: на тое служба!—устаў, апрануўся і пацягнуўся будзіць ахмістрыню.

Падыйшоўшы пад вакно, стаў сперша дэлікатна барабаніць па ім костачкай зложэнаго у кручок пальца, пасьля-ляпаць усей пецарнёй, урэшці, як пачаў пражыць кулаком у ваконную раму, дык праз нейкіе поўгадзінкі выпаўзла такі с пярыны тоўстая, прысадзістая ахмістрыня і, даведаўшыся, ў чым справа, валюхаючыся, як качка, пайшла ў пекарню, дзе сваімі пухлымі, чырвонымі кулакамі, як бач, падняла на ногі дзьвёх дзевак—спадручніц сваіх, і гэтак грамадай сунуліся на мейсцэ важнаго здарэньня.

Віднець ужо пачынало, калі ешчэ агонь, мігочучы, перэлетаў то з сьвінарніка ў пекарню, то с пекарні у сьвінарнік; і толькі днём, калі камісар па дакладу аканома і ахмістрыні ўпісаў у кнігі, што гэткаго-то чысла, месяца і года

Разгневаўся п. Солоневіч: як гэта? Ён жэ сам зрабіў тое „Бѣлорусское Общество“,—можна сказаць, выкарміў яго сваім млекам, а яно—бунтуецца! І пакінуў за гэта сваіх гадунцоў, ды, на злосць ім, напісаў у № 55 сваей газэты вось што:

„«Бѣлорусское Общество“ —організація надта маленькая, бо да яе належыць менш за 30 душ; але справа ў тым, што гэта—першая і едзіная пакуль-што *беларуская* організація, аснованая на этнографічным грунце і ў тым жэ самым часе прызнаўшая ня толькі поўнае едзінства, але і тожсамасць („тождество“) між беларусамі і вялікорусамі“...

Вось, наканец п. Солоневіч аткрыў карты! Ешчэ калі „Бѣлорусское Общество“ толькі аткрывалося, „Наша Ніва“ асьцерэгала беларусоў, што гутаркі яго організатароў аб „беларушчыне“—гэта туман у вочы, пад каторым хаваецца жаданьне зніштожыць да званьня ўсё тое, чым беларускі народ адзначываецца паміж іншымі націямі. Тады п. Солоневіч, каб давясьці, бытцым ён праўдзівы беларус, пісаў: „мы не будавалі Крэмля, і воды Масквы-рэкі для нас так сама ня маюць сьвятасьці, як і воды Віслы“... Цяперашняе выступленьне п. Солоневіча паказало, што мы не памыліліся, ня веручы ў шчырасць яго. І можна йшчэ падзякаваць п. Солоневічу вось за што: ён давёў, што такіх наіўных людзей, каторые могуць казаць аб „тожсамасьці“ беларусоў і вялікарусоў, ў Вільні не знайшлося і цельных трох дзесяткоў! Добра і гэта...

Як пакінуў п. Солоневіч „Бѣл. Общ.“, дык і прыйшлося выдумаць нешта новае. І гэтым разам, аткрываючы „національны хаўрус“, Солоневічы і ўся хаўрузія ўжо ясна кажуць, што іх мэта—перэрабіць беларусоў на расейцоў. Шчырае прызнаньне заўсягды лепей за махлярство: ня кажучы ўжо аб сумленьні, каторае у махляроў вельмі запэцкано, брэхню людзі скора пазнаюць, а тады неяк брыдка выходзіць, ды ешчэ шмат хто насьмешкі строіць...

Г. Б.

## З нашай мінуўшчыны.

### Земскіе суды.

„Устаўные граматы“, выданные беларускім землям вялікім князем Вітоўтам, успамінаюць аб земскіх судах,як аб ўсім вядомай організаціі; гэтак сама і „Статут“ (друкаваны па беларуску ў 1588 г.) толькі падцьверджае парадкі „судоваго земскаго ураду“, ссылаючыся на „даўные прывілеі і „стары іхні статут“. Гэткім чынам пачаткі організаціі земскіх судоў мы павінны адсунуць у глыбокую мінуўшчыну І дзеля таго, што земскіе суды выпрабляліся векамі на мейсцовым грунці, нельга установіць, калі яны зачаліся: яны развіваліся разам з народам і культурай яго.

У XVI сталецьці земскі суд складаўся с трох асоб: судзьдзі, падсудка і пісара. Усе тры гэтые судовые асобы выбіраліся „вольна“ на з'ездзі ўсіх абыватэлёў павету „ад высшаго, да нізшаго стану“, каторые у назначэны дзень прыбылі у той павет, або замак „гаспадарскі“. Як на судзьдзю, так на падсудка і пісара з'езц выбіраў чатырох кандыдатоў с паміж „людзей добрых, набожных, веры годных, а ў праве умеетных, пісаць умеючых, родічоў таго панства Вялікаго Княства і ў тым павеці ня нова, не зумышльне аселых“; адным словам, людзей справядлівых, ўсім вядомых, сьветлых. Выбраўшы кандыдатоў, упісывалі іх імёны ў „паданьне“ і за сваімі подпісямі і печацямі пасылалі на зацьверджэньне Вялікаго Князя. Вялікі князь павінен быў выбраць с паміж чатырох кандыдатоў аднаго на судовае мейсцо і зацьвярдзіць „да жывата яго“. Гэта значыць, што судзьдзя, раз выбраны і зацьверджэны, аставаўся судзьдзёй да сьмерці сваей, і ніхто, нават сам гаспадар, ня мог яго скінуць. Рабілося гэтак затым, каб суд ні ад каго не залежаў і мог судзіць на „нікога не агледаючыся“, толькі „павэдле права посполітаго (агульнаго) і сумленьня свайго“.

Пасьля выбароў і зацьверджэньня, на першых „рочках“ (заседаньні) новы судзьдзя павінен быў даць публічную прысягу, што будзе судзіць „не фольгуючы высокім і подлым станом, на достойносьцях і на врадех седзячых, (не зважаючы) на багатаго і на беднаго, на прыяцеля ані на непрыяцеля, на туташняго ані на госьця прыбылаго, не с прыязьні ані з васьні, не з боязьні ані за посулы і дары.. ані баючыся казьні, помсты і пагрозак“... На судовы урад право не пазваляло выбіраць асоб духоўных і тых, каторые мелі якіе небудзь іншые ўрады.

Суд адбываўся у асобным абшырным будынку, каторы ў часе судоў быў повен народу. Сходзіліся у суд тые, што мелі свае справы у судзе і чэкалі чароду, і тые, каторые хацелі паслухаць, хто с кім і за што судзіцца. Але гэта не с пустой толькі цікавасьці. Суд у XVI сталецьці—гэта была бытцым школа права, бо ў тые часы знаньне законоў было кожнаму вельмі патрэбно, а разам с тым было знакам культурнасьці, калі хто добра ведаў ўсе парадкі „права посполітаго“. А той, хто ня быў „сьвядомы права посполітаго“ і „абычаёў праўных“,—лічыўся за недавучку. Дый публіка на заседаньнях земскіх судоў ня толькі прыходзіла паслухаць, як цяпер: часта траплялося, што калі між публікай бывалі „паважаные і сьвядомые права посполітаго асобы“, то судзьдзі іх запрашалі к „разсудку праўному“, і яны мелі дарадчы голас пры судовых пастановах, апрача таго кожны, хто быў на судзе, меў право сказаць, што ведаў аб разбіранай справе, ня будучы сьведкай, або сказаць свой пагляд на справу.

Канцэлярыю вёў пісар пры помачы падпіскоў. На падпіскоў ішла ахвотна маладзёж, бо гэта служыло ім заместа школы да далейшай урадовай службы; а калі і ня меў на мэці быць ўраднікам, дык знаньне права надавало „полеру“. Дзеля гэтаго канцэлярыя заўсягды кіпела жыцьцём.

Словам, Беларусы ў XVI сталецьці мелі ўжо найлепшые—нават і павэдле цяперашняго паняцьця—суды, бо судзьдзі былі выбарные. дажывотные і незалежные ад ураду. Цяпер гэткіе суды маюць толькі найбольш культурные заходна-эўропэйскіе гасударствы, ды Злучэные Штаты Паўночнай Амэрыкі.

В. Л.

## На жалейцы.

Я ня пушчаю сьпеваю
Песьці-казкі аб Дунаю,
Хоць то сэрцэ с пушчай рвецца,--
А пад грушаю пахілай—
Што над бацькоўскай магілай
Граю толькі на жалейцы.

Я ня звон, што час нам лічэ,
І на вечэ праўду клічэ,
Хоць то сэрцэ звонам бьецца,—
А па шчасьці пахаваным,
Над рэкою, пад туманам
Граю толькі на жалейцы.

Я ня вецер вольны, спраўны,
Што пяе свабодай слаўнай,
Хоць то сэрцэ к славе рвецца,—
А ў цянётах павучыных,
На разстайных пуцявінах
Граю толькі на жалейцы.

Не на гусьлях звонкіх баю
Аб забраным недзе краю,
Хоць то сэрцэ к гусьлям рвецца,
А на спасьвеным узгорку,
Угледаючыся ў зорку.
Граю толькі на жалейцы.

Я ня гром, што сьветы крышэ,
І людзям законы пішэ,
Хоць то сэрцэ громам бьецца,--
Я паціху, чуць чуваці,
У чужой забыты хаці,
Граю толькі на жалейцы.

Граю, граю і чэкаю
Ўсходу сонца з-за Дунаю
Калі морэ ўскалыхнецца,
Калі песьню, гымн вясёлы
Нашым нівам, нашым сёлам
Я зайграю на жалейцы.

**Янка Купала.**

*Акопы.*

## Агляд зямлі.

Сціскла з расчотам жыў Яська Жыгала
І грошы па трошкі зьбіраў.
Даўно яму думка у сэрцэ запала,
Ён з ею зжываўся, зрастаў.
Выедзе ў поле ён с конікам сівым
Ці пойдзе с касою касіць,—
Любая думачка зданьнем шчасьлівым
І сонэйкам ясным бліщчыць.
Дома так сама. Бывала у сьвята
Аб думцы тэй мову зачне.
Мужу у руку гаворыць Агата
І ў вочы любоўна зірне...
А думаў Жыгала аб тым, каб зямелькі
Хоць дзе шматочэк купіць,
Бо дома бядота і сціск паўстаў велькі
І несчэга стала тут жыць.
Так жыў, прыслухоўваўся Яська Жыгала
Дзе, як прадаецца земля,
І купля якіе выгоды казала,
Як там ураджайны паля.

* * *

Былі ў Жыгалы сябры-гаспадары;
Адны у іх думкі былі
І ў сэрцы насілі аднакіе мары,—
Дабіцца, разжыцца зямлі.
Збяруцца, бывала, і люлькі закурацць,
Углыбяцца ў мову яны.
Лбы свае зморшчаць і бровы нахмурацць,
Калі ў чым замінкі відны.
От раз вясною, пад Яна, здаецца,
Гаворыць Жыгала сябрам:
„Чуў я, мужчыны, земля прадаецца,
„А разам з зямлёю і дом.
„Ёсць там і паша, і рэчка блізютка,
„І лесу кавалак ёсць там...

---

ад такіх-то бацькоў радзіўся рабы парсючок, ды занумэраваў яго,—ўсе супакоіліся. Толькі дзеўкам праз нейкі ешчэ час трэба было насіць маладой матцы асобную, лепшую яду, ахмістрыні—выдаваць на гэты корм іншую прымешку, а Марціну—часьцей зменяць падсьцілку. Але ускорасьці ўсё наладзілося, і жыцьцё паплыло сваім звычаем.

Гадаваўся Рабы на ўзьдзіў: і ў рост яго гнало, і сыць брала непамерна; але бо, праўду кажучы, і яды яму было не набрацца: сваю мерку спытлюе, дый пачынае сквірчэць,—ўсё яму падбаўляй, ды падбаўляй, а чаго ўжо сам не ўбярэ, дык хоць вывярне с пасудзіны, абы другі не пажывіўся. Калі-ж, бывала, выпушчалі сьвінскую моладзь на волю—крыху пабрыкаць, ніводзін так, як Рабы, не дурэў: ніводзін, як Рабы, ня вышукае так скора слабейшаго мейсца ў паркане і, хоць сам тоўстават, а такі праз невялічкую шчыліну і то выціснецца з выгана, ды першы уб'ецца у шкоду; але, калі прыйдзе які страх, першы і драпане адтуль, —дык ані калок, ані пуга ні разу не дакрануліся да яго дэлікатнаго цела! Забяруцца, бывала, сьвіньні ў сажалку пакупацца,—ўсе павылазяць адтуль мурзатые, укачаўшыся ў балота, а наш Рабы,—хоць разам валяўся,—выйдзе, страханецца, дзе паскрабецца і зноў чысты, гладкі, бытцым і ня быў там.

Час у выгодзе скора ляціць. Мінуў год, зляцеў другі, і не агледзіўся наш Рабы, як разбухаўся ўжо так, што і с хлева вылазіць ня хочэ; сядзіць на адным мейсцы і дзень і ноч, сапе, храпе, лыпае заплыўшымі салам маленькімі сваімі вочкамі, дый цяжка уздыхае, гледзючы на яду: змёў-бы, здаецца, ўсё, а як прыйдзецца—лізьне раз, другі і хоць ты што—ня лезе!

Гневаўся цяпер Рабы і на падрастаючую моладзь-падсьвінкоў: лётаюць, пішчаць, крычаць, дурэюць—ліха ведае чаго! От, сядзелі-б, як сядзіць ён—спакойна, важна—і не перэшкаджалі-б іншым дрэмаць. Злаваў Рабы і на непарадкі, якіе час ад часу бывалі у сьвінарніку: находзяць нейкіе людзі—і то хоць-бы свае, а то чужые; цягаюцца па загародках, хватыгуюць такіх, як ён—Рабы, важных свіньней; падыймаецца, разумеецца, на ўсю будывіну такі страшэнны гармідэр, што ажно жутка слухаць. Але ускорасьці ўсё супакоівалося,—супакоіваўся і Рабы і толькі дзівіўся, на што і каму патрэбны гэтые здзекі.

Ажно прыйцлі ўрэшці гэтые самые людзі і да яго — Рабога; прыйшлі зараня—ешчэ прыцемна—з ліхтарняй, сьвятло каторай так і рэзало заспаные вочы парсюка.

Стаў рохкаць нездаволены Рабы і ўжо думаў падняцца з гнезда, каб-ткі добра напудзіць няпрошэных гасьцей, калі пачуў, як нейкі вялізарны ціжар прываліў яго, а задніе абедзьве нагі бытцым ушчаміліся.. Гэткай зневагі ня мог сцярпець Рабы і толькі што хацеў разінуцца, ды крыкнуць так, каб ажно ўсе браты пачулі яго крыўду, як тут-жэ нейкая петля моцна сцягнула і заціснула яму лыч. Цяпер ён мог толькі ўжо сквірчэць; а тым часам ціжары валіліся на яго з ўсіх старон, прыдушывалі яго, выкручывалі яму ногі, цягнулі за вушы... і раптам пачуў Рабы, як нешта халоднае, сьлізкае ўпіваецца яму у грудзі... Задрыжэў Рабы са страху, а посьле і ад страшэннаго болю, бо тое, што сперша выдалося яму халодным, цяпер пякло у грудзёх жывым агнём, ды разам бухнуў гэты агонь у галаву і разляцеўся па ўсім целі..

Што прыйдзецца разставацца калі колечы з жыцьцём нават і сьвінскаму роду, аб гэтым Рабы чуў і ведаў, але аб сьмерці ніколі ня думаў. „На гэта будзе часу!“—пацешаў сябе Рабы,—„калі сьмерць стане падхадзіць“. І вось цяпер зразумеў ён, што гэта сьмерць і ня думала надыходзіць, а наляцела,—наляцела так неўспадзеўкі, як толькі можэ налетаць яна адна. І не аб гэтай сьмерці думаў ўжо Рабы, бо ведаў добра, што яе усё роўна ня міне: праз агнём пражэны мозг віхрам пралетало ўсё мінулае яго жыцьцё. Стараўся цяпер Рабы успомніць, што зрабіў ён праз час гэтаго жыцьця добраго і благога. Благога? Ці-ж ён каму зрабіў што благое? Не—гэтаго ня мог Рабы аб сабе сказаць. А добраго? Добраго—што-ж?? сьпешаўся, слабеючы ўжо, успомніць бедак. Ага: праз усё сваё жыцьцё нікому благога нічога не зрабіў, ну і.. смачна еў, смачна піў, смачна спаў. Ці-ж мала ешчэ гэтаго? І, з успакоіўшымся ўжо сумленьнем, апошні раз захроп Рабенькі і... даўся.

**Ядвігін Ш.**

„От бы абладзіць, ня ведалі-б смутка,
„Хлеб быў-бы і выгода нам“...
—„Дзіва, што быў-бы!“ ўздыхае Гаўрыла,
Люлькай аб кіпець бьючы:
„Асталевацца-б, жыў-бы, што міла,
„Ня гэтак, як тут жывучы!“
Доўга пра зямлю яны гаварылі,
Гарэлі іх вочы агнём;
Ім ўжо здавалось, зямлю што купілі
І новы пастроілі дом;
Кожны з іх садзік, бытцым, ўжо мае,
І гумны іх хлеба паўны...
—„Пойдзем, пабачым! хай Бог памагае“.—
Ў канцы парашылі яны.

* * *

Ходзяць па полю ў раздумьі мужчыны;
У перэдзі з стрэльбай лясьнік.
Іх твары сур'ёзны і важны іх міны,
Ды вырвецца часам ў іх крык.
—„От, брат, раўніна! і вокам ня скінеш;
„А глеба—глядзі, як тварог!
„Што за зямелька, брат! Купіш ня згінеш,
„Асесці-б тут Госпад памог“.
Кіем Жыгала зямлю калупае,
Да долу прыгнуўшыся весь;
Чорную грудку ў руках расцірае
І нюхае землю Алесь.
Трэйці, Гаўрыла, мужык барадаты,
Абводзіць вачыма ўсю даль
Радуе сэрцэ іх від той багаты,
Разстацца з зямлёю ім жаль.
Стражнік паказвае ім ўсе граніцы
І зжарам гаворыць такім:
—„Лес тут харошы! грыбоў і суніцы
„І ягады ўсякай ёсць ў ім.
„Рэчка пад бокам, і процьма ўсей рыбы...
„Тут рай, ягамосьці, ды ўсё!
„Гляньце, мужчыны, якіе сялібы!
„О добрае будзе жыцьцё!“
Слухаюць сябры, і сэрцэ іх млее,—
Здаецца-б да дому ня йшоў,
Шчасьцем, давольствам куток гэты вее,
Як люба срэдзь тоўстых дубоў!
Ходзяць зямельку любуюць мужчыны,
І сэрцэ іх бьецца, гарыць...
Так на каханку, любую дзяўчыну,
Хіба толькі хлопец глядзіць.

**Якуб Колас.**

## Перэд паводкай

Праясьняецца пагода,
Бо зьвярнулася весна.
Ўсё чэкаеш, што прырода
Ўстрэпянецца ада сна,

І пад птушчы крык і гоман,
Даўшы хвалям вольны ход,
Прыпадыйме бацька Нёман
На хрэбце магутным лёд.

Зазьвіняць жалобна крыгі,
І бурлівая вада
Сьнег, размоклы ў час адлігі,
Змые з луга без сьледа.

Дык разлійся-жэ раздольна
Ў чыстым полю і гаю,
І красой паводкі вольнай
Распалі душу маю!

**Максім Богдановіч.**

---

## З Беларусі і Літвы.

(*Ад уласных карэспандэнтоў*).

**Мінск.** Тут разбіралася справа сямьі Бонч-Осмолоўскіх і другіх асоб, каторых вінавацілі у арганізацыі „блонскаго селянскаго хаўрусу“ і ў другіх праступках. У гэтай справе судовая палата пастанавіла ўжо раз у студні 1911 года свой прыгавор, але сэнат не зацьвярдзіў яго паводлуг пратэста пракурора, каторы быў нездаволен, што глаўных віноўнікоў апраўдалі.

Вінавацілі падсудных у тым, што яны ў часе 1905—1908 гадоў у двары Блонь, Ігуменскаго павету, арганізавалі „мейсцовы селянскі хаўрус“ партіі соціалістоў-рэволюціонероў; гэты хаўрус ставіў бліжэйшай сваей мэтай аружнае паўстаньне і перамену устаноўленнаго законамі парадку. Але на судзе выявілося шмат цікавых драбніц, як напр., што сьведкі Швэдов і Останчык на дазнаньні фальшыва сьведчылі с прычыны пагрозак паліцыі і жандароў; што ўся справа паўстала на грунце 30 гадоваго шпіонства за Бонч Осмолоўскімі, каторые устроілі найбольш культурны двор, многа давалі на цэркву, школу, пагарэльцам, людзям, што яны нічога супольнаго ня мелі з мітынгамі і рэволюцыей 1905 г., і іх найміты так сама, як і па другіх мейсцох, рабілі забастоўкі, і паліцыя гэтаму зумысьля не перэшкаджала.

Баранілі абвінавачэных трое адвакатоў: два с Пецербурга і адзін з Мінска.

Пасьля чатырохгадзіннай нарады, палата прыгаварыла Анатолія і Варвару Бонч-Осмолоўскіх у крэпасць на 8 мес., залічаючы тые 8 мес., што яны прасядзелі да суда; сына іх, Івана, на 6 мес., залічаючы 2 мес.; Ермоліну—$1\frac{1}{2}$ года, залічаючы 2 мес.; Мігуцкаго—4 мес., залічаючы 4 мес. Федорэйчыка—на 1 год, залічаючы 2 мес.; Лукашына—$1\frac{1}{2}$ года; Вахоўскаго апраўдалі. *Мікола Камароўскі.*

**Несьвіж**, Мінск. губ. У ваколіцах Несьвіжа кампанія маладых хлапцоў беларусоў-каталікоў у часе запуст устроіла тэатр у вясковай хаці. Ігралі тры камэдыі на польскай мове. Хату прыбралі тканінамі свайго вырабу. І цешацца хлопцы, што хата была прыбрана беларускімі тканінамі, што дзеўчаты, каторые выступалі, былі адзеты па беларуску; а аб камэдыях маўчаць. Мабыць цешыліся-б і с камэдый каб яны былі ў іх роднай беларускай мове, а не па варшаўску. *Падарожны.*

**Астрошыцкі Гародок**, Мінск. губ. і пав. Нідалёка нашаго мястэчка адзін гаспадар выкапаў студню 9 сажнёў глыбіні, але вады не дастаў. Тады сусед адкупіў у яго ізруб, каторы устаўлялі у студню і наняўшы ад сябе чэлавека, спусціў яго у студню даставаць ізруб. Той дастаў некольні ізрубін, аж там як абрунецца увесь ізруб і земля, так, што уся студня зароўнавалася з зямлёй і засыпала таго чэлавека. Цяпер прыслалі з Мінска арыштантоў і капаюць нанова, чатыры аршыны шырынёй у ва ўсе бакі, каб дастаць таго чэлавека. *Н-далёкі.*

**Валожын**, Віленск. губ. Ошм. пав. Каля нас вельмі цешыліся, што посьле марознай зімы неяк скора пагнаў сьнег і думалі, што ужо будзе цёпла; бо у гэтым гаду зіма, хоць ня вельмі была доўгая, але добра далася у знакі. Мала таго, што парадна пражыў мароз, але посьле сухога лета вада павыбіралася ў калодзіжах і яе трэба было вазіць, як сабе так і скацінцы за некольні вёрст; цяпер затое вады ужо маем даволі, але таго цепла якога усе спадзеваліся, дык нешта немашака, бо (цяпер) насталі нейкіе золкіе і слотные дні, часта праходзіць дождж с сьнегам, а гразі ані вылезьці хутчэй да восені чым да вясны падобна. Без пары згінула дарога і шмат хто астаўся бяз дроў і бяз сена, спадзеючыся, што ешчэ будзе мець ня гэто часу, а цяпер за благой дарогай гэтаго зрабіць нельга. *Стары Улас.*

**Высокі-Двор**, Троцк. пав. Віленск. губ. Тутака аткрываецца сельска-гаспадарскі кружок. Першае заседаньне было ў нядзелю, (18 марца). Так сама будзе аткрыто і крэдытовае таварыство; членская плата 10 руб. Падпісаліся, як члены-учрэдзіцелі, 34 душы заместа патрэбных па закону 20,—значыць, людзі востра ўзяліся за гэту справу. С казны таварыство дастае пазычку 2.000 рублёў. *Эс.*

м. **Гэрманавічы**, Віленск. губ. Дзіс. пав. Падходзіць Вялікдзень і па нашых вёсках хлопцы рыхтуюцца хадзіць з валачобным. Ужо цяпер збіраюцца па хатах і пяюць „Хрыстос“. Калі-ж прыйдзе вечэр Вялікадня, ўся округа ажно дрыжыць ад ноты гэтай старасьвецкай песьні.

Дзісенка ўжо сагнала лёд, і ганкі паплылі на Дзьвіну, а Дзьвіною ў Рыгу.

У нашых ваколіцах за зіму нішто зараблялі людзі каля лесу, хоць ўжо лясы і зваліся. *Баяравец.*

**Крынкі**, Гродз. губ. і пав. Ў гэтым мястэчку жыве шмат інтэлігентоў, але мала між імі людзей. Мястэчко не мае ніякаго духоўнаго руху; за ўсё аддуваецца гарэлка і карты. Пьюць ўсе пагалоўна Дзе ні сабяруцца на вечарынку, без гарэлкі ня абыйдзецца. Пра тэатр ім ні гавары: адны проста асьмяюць, другіе мо і прысталі-б... на славах. Страшна і сумна робіцца на душэ, як падумаеш, што будзе далей. Людзі забудуць, што яны—людзі; забудуць тую, векамі дабытую, культуру, каторую падарылі ім іх бацькі і дзяды. Пара! Пара. Час ня цярпіць і чэлавек павінен усімі сіламі старацца не атставаць ад яго ні на крок. Будзем надзеяцца, што і нашы крынчане адумаюцца і возьмуцца за агульную працу над развіцьцем ня толькі свайго соціальнаго палажэньня, але і сіл духоўных, каторыя важней ўсяго. *Янук Д.*

в. **Бель**, Могілеўск. губ. Горэцк. пав. Палавіна, а ня ўсе селяне нашай вёскі выдзяліліся на хутары, чым як бы паказалі, што яны дзеляцца на два лагеры. Каб ніхто ў тым не сумневаўся, яны і адпалілі такую штуку. У сьвята, замарконіўшыся на хутарах, хутаране прыйшлі да вяскоўцоў пачэсаць языкі. Вось адзін з іх і заспорыў, знаць, аб тым, што яго піпка куды лепшая, чым ў яго суседа-вяскоўца. „Як лепшая?“ Ну і пачалі крэмсаць адзін аднаго па санках. Вяскоўцу памаглі свае; свае памаглі і хутараніну, ды ладна падзялілі паміж сабой бубашак: каля 10 піджакоў, ды кашуль парвалі, ня лічучы парваных твароў, паламаных галоў і рук. *Саўка Каваль.*

---

## З усіх старон.

**Пецербург.** На з'ездзі студэнтоў акадэмістоў (тых, што належаць да саюзу „істінно-рускіх“ і „націоналістоў“) усе члены яго у сваіх прамовах плакалі, што ім патрэбны субсыдыі. Пастаноўлено старацца аб падмогу с казны.

= Арэштаваные за прыналежнасць да студэнцкай сходкі студэнты пачалі галадоўку.

= Упраўляючы пецербурскім аддзелам акційнаго таварыства горных і сталеліцейных заводоў, Грюнберг, і бухгальтэр Ульрых уцяклі за граніцу, захапіўшы 200 тысяч рублёў; трэйці учасьнік, арцельшчык Лешков, застрэліўся.

= На расейска-фінляндзкай граніцы два салдаты с пагранічнай стражы застрэлілі камандзера отрада, ротмістра Мальчэвскаго. На мейсцо паехалі судовые і ваенные ўласьці.

= У пецербурскім акружным судзе разбіралася справа быўшаго камэргера, сына прадседацеля Гас. Рады, Стояновскаго. Стояновскаго вінавацілі за машэнствы. Ён прыйшоў на кватэру купчыхі Варыхановой і ўзяў у яе ашуканскім способам 3 тысячы рублёў, а посьле ешчэ два разы выманіў каля 5 тысяч; але ўрэшці купчыха дадумалася, што яе ашуківаюць, і пазвала паліцыю. Стояновскаго засудзілі на год у турму.

**Лодзь.** У Лодзі ў ночы невядомые людзі напалі на двох стражнікоў. Застрэліўшы іх абодвых, разбойнікі забралі ад іх стрэльбы і уцяклі. Паліцыя зрабіла вялікую аблаву. Многа людзей арэштавалі, але ці на сьлед разбойнікоў напалі, нет ведама

**Тамбов.** У Тамбове быў суд над 19 інтэндантамі, іх паштрафавалі і скінулі са службы, аднаго засудзілі у арэштанцкіе роты, чатырох апраўдалі.

**Бадайбо.** Іркуцк. губ. Тут разшырылася забастоўка ў капальнях, дзе дастаюць золата. Цяпер бастуюць работнікі на ўсіх капальнях. Кожнаго дня адбываюцца сходкі. У надзёжнінскіх капальнях заседае забастовачны комітэт. Работнікі вымагаюць 8 гадзіннаго рабочаго дня, прыбаўкі заработнай платы (на 30 працэнтоў) і скасаваньня штрафоў.

**Рэвель.** (Ад ўласнаго карэспандэнта). Некольні дзён таму назад па Фінскім заліве атарвалася бальшая скрыжніца лёду, на каторай ў тым часе было каля 300 чэлавек рыбакоў з многімі канямі і запасам і атагнала яе к маленькаму астраўку (проста толькі отмел „Нанкі“, каторы блізка маяка „Тютэрс“ і с катораго цяпер ідуць весткі па тэлеграфу, што рыбакі знаходзяцца ў вельмі небеспечным палажэньню. На ратунак іх з Рэвеля выйшлі параходы. Але як чутно яны вельмі ціха ідуць, бо непускае лёд, дык нет ведама і ці пасьпее у пару.

= Тутэйшая багатая паня фон-Урліх падаравала тутэйшай суполцы землядзельля, свой уласны двор „Кеддэр“ вартасьцю 150 тысяч руб. для навукі сельскай гаспадаркі. Важны прыклад шчырасьці, на карысць грамадзянства. *К. О—Чэркас.*

---

**Турцыя.** Пішуць газэты, што Турцыя пасьпешна прыгатаўлкецца да вайны на руска-пэрскай граніцы.

---

Пры гэтым нумэры разсылаем вясковым падпішчыкам КАТАЛОГ сельска гаспадарскіх машын і прылад фірмы «Зыгмунт Нагродзкі» у Вільні, і усім № 1 сельска гаспадарскаго месячніка «САХА».

---

**Чародны нумэр выйдзе 5 (18 красавіка.**

---

Рэдактар-Выдавец
А. Ўласоў.

---

**„САХА“**

**Першы беларускі месячнік сельскай гаспадаркі**

Выйшла ужо першая кніжка.

«САХА» будзе даваць практычные рады па ўсіх аддзелах сельскай гаспадаркі, дастасаваные да нашых варункоў і клімату

**ПАДПІСНАЯ ЦЭНА:**

На 1 год . . . . . 1 руб. 20 кап.
на 6 месяцеў . . . — » 60 »

Цэна асобнаго нумэру 8 кап., з дастаўкай да хаты 10 кап.

**Пробны нумэр высылаецца дарма.**

*Адрэс рэдакціі: Вільня, Завальная 7.*—Рэдактар-выдавец **А. Ўласоў.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская, д. № 20.